# Весці
## Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка

Штоквартальны навукова-метадычны часопіс. Выдаецца з чэрвеня 1994 г.

**№ 1 (43) 2005**

СЕРЫЯ 2.
Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія.
Эканоміка. Культуралогія

## Змест

*Галоўны рэдактар:*
**П. Дз. Кухарчык**

*Рэдакцыйная калегія:*
Н. Г. Алоўнікава
В. А. Бондар
*(нам. галоўнага рэдактара)*
В. В. Бушчык
*(нам. галоўнага рэдактара)*
Ю. А. Быкадораў
*(нам. галоўнага рэдактара)*
А. М. Вітчанка
С. Я. Гайдукевіч
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
В. М. Дабранскі
Л. М. Давыдзенка
А. В. Данільчанка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч
І. В. Катляроў
П. В. Кікель
Н. І. Копысава
*(адказны сакратар)*
Г. А. Космач
Н. І. Кунгурава
І. Я. Леваш
А. М. Люты
У. А. Мельнік
І. А. Новік
В. М. Русак
А. І. Смолік
В. Дз. Старычонак
В. Б. Таранчук
І. С. Ташлыкоў
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
А. С. Цернавы
Л. Н. Ціханаў
І. І. Цыркун
М. Г. Ясавееў
М. С. Яўневіч

*Гісторыя*

*Цітовіч І. У.* Заканадаўчыя аспекты краязнаўчага руху Заходняй Беларусі (1921—1939 гг.) .......... 3
*Мельнікаў І. В.* Сучасныя польскія перыядычныя выданні аб сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі перыяду капіталізму (1861—1914) на прыкладзе часопісаў «Przegląd Wschodni» і «Lithuania» .......... 10
*Касовіч В. Ф.* Гістарыяграфія XX ст. аб гісторыі дваранства Беларусі (другая палова XVIII — першая палова XIX ст.) .......... 14
*Навагродскі В. Я.* Функцыі земскага друку Паўночна-Заходняга краю пачатку XX ст. і іх рэалізацыя .......... 18
*Пуцік У. С.* Асаблівасці працэсу фарміравання сялянскай буржуазіі ў Беларусі ў парэформенны перыяд .......... 22
*Поляк Н. А.* Дысідэнты-пратэстанты беларускіх зямель у знешнепалітычных стасунках Прусіі і Рэчы Паспалітай (канец XVII — пачатак XVIII ст.) .......... 25
*Канапацкая В. І.* Фарміраванне татарскіх паселішчаў у Вялікім княстве Літоўскім (XIV—XVII стст.) .......... 29
*Канапацкі І. М.* Канфесіянальныя сувязі беларускіх татар з Таўрычаскім магаметанскім духоўным праўленнем (канец XVIII — пачатак XX ст.) .......... 33
*Груца І. А.* Вывучэнне пытання лёсу маскоўскіх трафеяў у дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі .......... 35
*Груца І. А.* Разгляд пытання лёсу маскоўскіх трафеяў у гістарыяграфіі савецкага і постсавецкага перыядаў .......... 38
*Лапановіч С. Ф.* Дабрачынная дзейнасць нацыянальных арганізацый па аказанні дапамогі бежанцам у Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны .......... 41
*Мацеюк В. П.* Галоўнае бюро яўрэйскіх секцый пры ЦК КП(б)Б: стварэнне, задачы і асноўныя напрамкі дзейнасці (1917—1930 гг.) .......... 46
*Доўнар Л. А.* Падатковая палітыка ў Савецкай Беларусі ў адносінах да прыватнай вытворчасці ў першай палове 20-х гг. XX ст. .......... 49
*Каспяровіч А. М.* Тэхнікумы ў сістэме адукацыі Савецкай Беларусі ў 20-х гг. XX ст. .......... 54
*Жылінская І. У.* Усесаюзнае таварыства культурных сувязей з замежжам: мэты і задачы дзейнасці .......... 58
*Важнік В. М.* Навуковае супрацоўніцтва паміж вышэйшымі навучальнымі ўстановамі Польшчы і Беларусі ў 50—70-х гг. XX ст. .......... 60
*Рабцава Н. А.* Забеспячэнне інжынерна-тэхнічнымі кадрамі чыгуначнага транспарту Беларусі ў 1945—1964 гг. .......... 65
*Космач А. М.* Цэнтральна-Усходняя Еўропа паміж Усходам і Захадам у пачатковы перыяд «халоднай вайны»: асноўныя напрамкі знешняй палітыкі ЗША (1943—1946 гг.) .......... 70
*Варывончык І. В.* Дыскусійныя пытанні росту сацыяльнай няроўнасці ў ЗША .......... 76

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ся ў доме мулы І. Міскевіча [7, 4—5]. Разбор гэтай справы цягнуўся доўга, больш за два гады. 27 снежня 1867 г. Таўрычаскае магаметанскае духоўнае праўленне, заслухаўшы на сваім пасяджэнні даклад мулы Мірскай мячэці Ібрагіма Міскевіча і разгледзеўшы матэрыялы расследавання, дасланыя Навагрудскім паліцэйскім упраўленнем, устанавіла, што мула І. Міскевіч узяў кнігі з мячэці для выдачы метрычных выпісак прыхаджанам за 1832—1865 гг. Гэта было парушэннем інструкцыі аб захоўванні метрычных кніг, якія павінны былі знаходзіцца ў мячэці. Таўрычаскае магаметанскае духоўнае праўленне аб'явіла І. Міскевічу строгую вымову і загадала «на будущее время не удерживать метрические книги и никакие другие мечетные принадлежности и бумаги, а хранить таковые в мечети» [7, 9—10].

У 1891 г. было распачата пераўтварэнне Таўрычаскага магаметанскага духоўнага праўлення і было вырашана «изъять татар западных губерний по духовным делам из владения означенного правления и подчинить их мулл общему гражданскому управлению» [10, 95]. Але, разглядзеўшы гэтую справу, пакінулі іх у Таўрычаскім духоўным праўленні.

Таўрычаскае магаметанскае духоўнае праўленне разглядала на сваіх пасяджэннях у асноўным справы, звязаныя з пабудовай або рамонтам мячэцей у беларуска-літоўскіх губернях і скаргі прыхаджан-мусульман, якія былі не згодны з выбраннем таго ці іншага мулы альбо дзейнасцю некаторых духоўных асоб. Справы часта расцягваліся на доўгі час з-за вялікай адлегласці паміж Крымам і Мінскам, Вільняй або Гародняй. У матэрыялах Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва ў Мінску намі знойдзены дакументы, якія сведчаць аб сувязях тутэйшых мусульман з Таўрычаскім магаметанскім духоўным праўленнем на вышэйшым узроўні. Гэта паведамленне мінскага віцэ-губернатара, які на той час выконваў абавязкі кіраўніка губерні, слуцкаму, ігуменскаму і навагрудскаму павятовым спраўнікам аб маючым адбыцца ў жніўні 1907 г. наведванні таўрычаскага муфты вышэйзгаданых паветаў з мэтай знаёмства з жыццём і дзейнасцю мусульманскіх абшчын [9; 61; 62].

Такім чынам, татары-мусульмане заходніх губерняў Расійскай імперыі падтрымлівалі пэўныя сувязі са сваімі адзінаверцамі. Адасобленыя на працягу дзесяцігоддзяў ад ісламскага свету, яны зберaглі сваю веру, традыцыі і культуру. Іслам быў галоўным фактарам, які спрыяў захаванню нацыянальнай самасвядомасці беларускіх татар у іншаэтнічным і іншарэлігійным асяроддзі. Добрым узаемаадносінам татарскага народа з іншымі народамі беларуска-літоўскіх губерняў спрыялі працавітасць і высокая маральнасць. Таму тут не ўзнікалі міжэтнічныя і міжканфесіянальныя канфлікты паміж татарамі і іншым насельніцтвам.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

*Літаратура*


1. *Мухлинский А.* Исследование о происхождении и состоянии литовских татар. Спб., 1857.
2. Наш радавод. Гродна, 1992.
3. *Hazbijewicz Selim.* Polonya musulmanlari. Emel. 1992. № 190.
4. Цэнтральны дзяржаўны архіў Крыма (далей ЦДАК), ф. 315. Таўрычаскае Магаметанскае Духоўнае Праўленне, воп. 1, спр. 328, л. 25, 27а, 73, 90, 122.
5. ЦДАК, ф. 315, воп. 1, спр. 972, л. 1—64.
6. ЦДАК, ф. 315, воп. 1, спр. 979, л. 3, 4, 6, 8, 14—17, 23, 29, 31—33, 38, 69—70.
7. ЦДАК, ф. 315, воп. 1,спр. 1180, л. 1—10.
8. ЦДАК, ф. 315, воп. 3, спр. 4, л. 7, 9.
9. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску (далей НГАБ), ф. 295, воп. 1, спр. 7696, л. 59—62.
10. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (далей РДГА) у Санкт-Пецярбурзе, ф. 821, воп. 8, спр. 686, л. 95.



*Summary*

*In the article on the original archival materials one of the less research pages of Belarussian Tatars history, their confessional relation with Crimea is revealed.*


УДК 930"19"

***І. А. Груца***

## ВЫВУЧЭННЕ ПЫТАННЯ ЛЁСУ МАСКОЎСКІХ ТРАФЕЯЎ У ДАРЭВАЛЮЦЫЙНАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

Узнікненне словазлучэння «маскоўскія трафеі» звязана з рашэннем Напалеона вывезці ў Францыю гісторыка-культурныя і рэлігійныя рэліквіі рускага народа з праваслаўных сабораў і ўрадавых устаноў Крамля. Менавіта яны былі закліканы служыць наглядным доказам заваявання старажытнай сталіцы Расійскай імперыі, а гэта значыць, перамогі ў ваеннай кампаніі 1812 г. Аснову маскоўскіх трафеяў склалі хрысціянскія святыні, найбольш

ушаноўваемыя іконы, сярэбраныя царкоўныя рэчы з Архангельскага і Успенскага сабораў, а таксама воінскія даспехі рускіх цароў і трафейныя знамёны з Аружэйнай палаты [1, с. 200—202].

Прадстаўнікі дваранскай і буржуазнай гістарыяграфічных школ удзялялі шмат увагі спусташэнню Масквы ў 1812 г. Сапраўды, у іх даследаваннях асноўны ўпор рабіўся на бясчынствы марадзёраў у адносінах да мірных жыхароў, рабаванне лавак і магазінаў, апаганенне праваслаўных храмаў і іх знішчэнне ў полымі шматдзённага пажару. Пытанне аб захопленых у маскоўскім Крамлі напалеонаўскай арміяй трафеях доўгі час зусім не паднімалася.

Чым жа можна было растлумачыць адсутнасць да гэтай тэмы навуковага інтарэсу з боку дарэвалюцыйных гісторыкаў? Уяўляецца, што тлумачэнне заключаецца ў адносінах да праблемы лёсу маскоўскіх трафеяў Напалеона з боку вышэйшых службовых асоб Расійскай імперыі і іерархаў Рускай Праваслаўнай царквы.

Ужо ў ходзе руска-французскай вайны 1812 г. і адразу пасля яе заканчэння на старонках перыядычнага друку разгарнулася палеміка аб лёсе нацыянальнай святыні рускага народа — аб крыжы са званіцы Івана Вялікага ў Крамлі. Яе вынікам стала афіцыйная версія, згодна з якой крыж рабаўнікамі з Масквы не вывозіўся і ён па таянні снегу быў знойдзены каля сцен званіцы [2, с. 345]. Інакш кажучы, спроба Напалеона замахнуцца на рускую нацыянальную святыню скончылася няўдачай. Далей, у пісьмах і рапартах маскоўскага губернатара графа Растапчына сцвярджалася, што ўсе каштоўнасці з горада былі своечасова эвакуіраваны. Гэта інфармацыя не адпавядала рэальнасці, што ў выніку прызнаў сам Растапчын [3, с. 18]. Адрасатам рапартаў з'яўляўся імператар Аляксандр І і з яго боку або з боку ўрада прыведзеная ў іх інфармацыя не абвяргалася. Такім чынам, сцвярджэнне Растапчына аб паспяховай эвакуацыі гістарычных і рэлігійных каштоўнасцей з Масквы было пакладзена ў аснову афіцыйнай пазіцыі дзяржавы па дадзеным пытанні.

Яе сутнасць заключалася ў тым, што трафеі напалеонаўскай арміі складалі прадметы раскошы і іншыя каштоўнасці, нарабаваныя ў дамах гараджан і ў няўрадавых установах Масквы. А паколькі Вялікая армія амаль поўнасцю загінула ў ходзе адступлення і яе абозы сталі здабычай рускіх войскаў, то ўсё нарабаванае не пакінула мяжы Расійскай імперыі.

Такі падыход да лёсу маскоўскіх трафеяў панаваў на працягу ўсяго праўлення імператара Аляксандра І, як мага лепш адпавядаў яго славе пераможцы Напалеона. На самай справе, войскі захопніка поўнасцю разбіты, іх правадыр дзівам пазбег ганебнага палону, усё нарабаванае непрыяцелем адбіта доблеснымі рускімі воінамі! Збавіцель Еўропы, у ролі якога выступаў Аляксандр І на Венскім Кангрэсе, не хацеў і не мог з-за гонару распытваць пра лёс некалькіх павозак з прадметамі з Аружэйнай палаты і цэркваў маскоўскага Крамля. У той час, калі абмяркоўваўся перадзел напалеонаўскай імперыі, устанаўліваўся новы парадак у Еўропе, пытанне аб лёсе маскоўскіх трафеяў выглядала малазначным, і пра яго забываліся.

Пытанне аб лёсе нарабаваных напалеонаўскімі войскамі гістарычных рэлігійных рэліквій рускага народа было паднята ўжо ў час праўлення імператара Мікалая І. У гэты перыяд гісторыкі перайшлі ад простага апісання падзей вайны 1812 г. да ўсведамлення яе вынікаў. Так, у даследаванні Міхайлоўскага-Данілеўскага «Апісанне Айчыннай вайны 1812 года» ўпаміналася аб рабаванні напалеонаўскімі войскамі Аружэйнай палаты, Арсенала, дварцоў і храмаў маскоўсага Крамля. Ён першым напісаў аб тым, што для перавозкі трафеяў быў сфарміраваны спецыяльны абоз, і прапанаваў некалькі версій далейшага іх лёсу, выказаў думку аб тым, што ў абозе знаходзілася. Міхайлоўскі-Данілеўскі амаль даслоўна выклаў версію генерала са світы Напалеона графа Сегюра аб затапленні найбольш грувасткіх трафеяў у Семлеўскім возеры, а таксама зазначыў, што іх тапілі і каля Оршы пры пераправе Вялікай арміі праз Днепр [4, с. 49]. Знамянальна, што Міхайлоўскі-Данілеўскі абмяжоўваўся толькі канстатацыяй гэтых версій і не выказаў да іх сваіх адносін.

Аб рэальнасці існавання трафеяў і загадзе патапіць іх у Дняпры настойваў і гісторык Н. Палявы ў кнізе «Гісторыя Напалеона» [5, с. 87]. Урэшце ні Міхайлоўскі-Данілеўскі, ні Палявы не праводзілі ў сваіх працах спасылкі на выкарыстоўваемыя крыніцы, таму ўстанавіць іх верагоднасць не ўяўляецца магчымым.

У адрозненне ад іх, вядомы ваенны гісторык другой паловы XIX ст. М. Багдановіч, гаворачы аб маскоўскіх трафеях Напалеона, упершыню спаслаўся на апублікаваныя да таго часу сведчанні ветэранаў Вялікай арміі [6, с. 7].

Зыходзячы з крытычнага палажэння, у якім аказалася напалеонаўская армія пры пераправе праз Беразіну, яе наваколле разглядалася асобнымі гісторыкамі як адно з самых

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

верагодных мест захавання маскоўскіх трафеяў [7, с. 68, 180, 349, 366, 1462].

І мабыць, апошняе месца, з якім звязана знікненне трафеяў, было зафіксавана ў мемуарах ветэранаў Вялікай арміі. Мемуары публікаваліся цалкам як асобныя выданні або ўрыўкам у перыядычным друку. Сведчанні ўдзельнікаў паходу ў Расію ў 1812 г. пацвярджалі факт рабавання маскоўскага Крамля і фарміраванне спецыяльнага абозу для перавозкі трафеяў [10, с.179; 84, 89, 120; 50; 160; 1437—1438; 1462; 758; 106].

Адначасова ў архівах назапашваліся дакументы, якія мелі непасрэдныя адносіны да праблемы лёсу маскоўскіх трафеяў і іншых каштоўнасцей, нарабаваных у Расіі салдатамі Вялікай арміі. Як толькі адносіны паміж Расіяй і Францыяй палепшыліся, апошнія сталі звяртацца з прашэннямі дазволіць ім пошук схаваных пры адступленні трафеяў [11, л. 1—6; 12; 162; 17—26 аб.; 11—16;1—6; 12—16; 1—19]. Перапіска па гэтай прычыне, ход і вынікі пошукаў, афармленыя ў выглядзе афіцыйных рапартаў, перадаваліся на захоўванне ў архівы пад грыфам «сакрэтна» і таму для даследчыкаў былі недаступныя.

Не маючы доступу да першакрыніц, гісторыкі не падвяргалі сур'ёзнаму навуковаму аналізу разрозненыя факты аб рабаванні ў 1812 г. маскоўскага Крамля. Адсутнасць навуковага інтарэсу да адзначанай праблемы прывяло да паступовай трансфармацыі яе ў разрад падзей займальных, але не сур'ёзных, якія не заслугоўваюць увагі акадэмічнай навукі.

Як вынік тэма лёсу напалеонаўскіх скарбаў у тым ліку і маскоўскіх трафеяў, страціла самастойнае значэнне. Яе сталі выкарыстоўваць як прывабны фон, напрыклад для папулярызацыі знешнепалітычнага курсу ўрада Расійскай імперыі.

Так, у канцы XIX ст., у перыяд паляпшэння адносін паміж Расіяй і Францыяй, у перыядычным друку часта публікаваўся матэрыял аб апошнім ветэране Вялікай арміі Ж. Б. Савене. Як высветлілася, ён трапіў у палон на Беразіне ў лістападзе 1812 г., застаўся жыць у Расіі, дзе памёр ва ўзросце 106 гадоў. Ва ўсіх публікацыях на гэту тэму асаблівая ўвага звярталася на тое, што менавіта Ж. Б. Савене ўзначаліў ахову абозу з казной Вялікай арміі, якая быццам бы патанула пры пераправе праз Беразіну [12, с. 3—12].

Першай спробай навуковага асэнсавання асобных аспектаў праблемы лёсу маскоўскіх трафеяў Напалеона стаў даклад гісторыка С. Н. Цяткова пад назвай «Вываз дзяржаўных скарбаў з Москвы ў 1812 г.». Ён быў абвешчаны ў пачатку XX ст. на пасяджэнні Таварыства прыхільнікаў памяці вайны 1812 г. [13, с. 6—7].

З даклада вынікала, што генерал-губернатар Масквы граф Ф. В. Растапчын стаў прымаць актыўныя загады для эвакуацыі дзяржаўных скарбаў з Крамля толькі пасля заканчэння Барадзінскай бітвы. За адбор прызначаных да эвакуацыі з крамлёўскіх палацаў і храмаў каштоўнасцей адказвалі начальнік палацавай экспедыцыі, сапраўдны тайны саветнік, сенатар обер-цырымоніймайстар П. С. Валуеў, а таксама чыноўнік гэтай экспедыцыі Паліванаў. У абавязкі апошняга ўваходзіла падрыхтоўка адабраных каштоўнасцей да транспарціроўкі. Для гэтай мэты Паліванавым было запатрабавана ад Растапчына 250 коней.

Катастрафічны недахоп часу прымусіў чыноўнікаў адмовіцца ад эвакуацыі найбольш груваcткіх гістарычных рэліквій Крамля і ўпрыгожанняў яго храмаў. У іх лік трапілі аконныя рамы з серабра, старажытная зброя і сукенкі, габелены, касцюмы і плацці. Пакінуць гэтыя каштоўнасці без нагляду Паліванаў не меў права. Выхад быў знойдзены ў закладцы шматлікіх тайнікоў на тэрыторыі Крамля. Праца па іх стварэнні ішла адначасова з падрыхтоўкай да эвакуацыі адабраных каштоўнасцей. Запаўненне тайнікоў і іх маскіроўка працягвалася да з'яўлення на вуліцах Масквы перадавых атрадаў напалеонаўскіх войск.

На працягу 39 дзён напалеонаўская гвардыя была гаспадаром Крамля. Валуеў быў у ліку першых, хто наведаў яго пасля адходу з Масквы французаў, вымушаны быў прызнаць факт рабавання многіх тайнікоў.

Далейшаму вывучэнню праблемы лёсу маскоўскіх трафеяў Напалеона перашкодзіла Першая сусветная вайна, а потым рэвалюцыя.

*Літаратура і крыніцы*


1. Histoire de la Campagne de Russie pendant l'annee 1812 ...Paris, 1848. T. 2. P. 200—202.
2. Примечание Кремлевского жителя // Вестник Европы. 1813. Ч. 67. С. 149—150; Труды Московского отдела Императорского Русского Военно-Исторического Общества. М., 1912. Ч. 2. С. 345.
3. РГИА, ф. 797, оп. 1, д. 4449, л. 18.
4. *Михайловский-Данилевский*. Описание Отечественной войны 1812 года. СПб., 1840. Ч. 4. С. 49.
5. История Наполеона // Сочинения Николая Полевого. СПб., 1848. Т. 5. С. 87.
6. *Богданович М.* История Отечественной войны 1812 года по достоверным источникам. СПб., 1860. Т. 3. С. 7.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

7. *Альбовский Е.* Клады по берегам реки Березины // Исторический вестник. 1898. Ч. 2. С. 68; *Михайловский-Данилевский.* Описание Отечественной войны 1812 года. СПб., 1840. Ч. 4. С. 180; *Дубровин Н.* Годовой за 1911 год отчет секретаря Кружка Ревнителей памяти Отечественной войны 1812 года. СПб., 1911. С. 1; *Tysczkiewicz E.* Opisanie poviatu Borisowskiego. Wilno, 1847. S. 97—100; *Альбовский Е.* Клады по берегам реки Березина // Исторический вестник. 1892. Ч. 2. С. 603—621; К столетию Отечественной войны // Новое время. 1911. № 12615; Записки Северо-Западного отдела императорского русского географического общества. Вильна, 1910. Кн. 1. С. 244—245; *Цехановский В.* Хроника поместья Бочейково. Витебск, 1905.
8. Отечественная война в письмах современников // Записки императорской академии наук. СПб., 1882. С. 349, 366; *Шевалье д'Изарн.* Воспоминания московского жителя о пребывании французов в Москве // Русский архив. 1896. № 2. С. 1462.
9. *Ниве П. А.* Отечественная война. СПб., 1911. Ч. 5. С. 776.
10. *Арман де Коленкур.* Мемуары. Поход Наполеона в Россию. М., 1943. С. 179. *Де-Сегюр Ф.* Поход в Москву в 1812 году. М., 1911. С. 89, 84, 120; Бургонь. Пожар Москвы и отступление французов. 1812 год. СПб., 1898. С. 50; Воспоминания о России Армана Домерга // Исторический вестник. 1881. Т. 4. С. 160; *Шевалье д'Изарн.* Воспоминание московского жителя о пребывании французов в Москве // Русский архив. 1869. № 2. С. 1437—1438, 1462; Мемуары полковника Жолио о 1812 г. // Исторический вестник. 1903. Т. 92. С. 758; *Харкевич В. И.* Мемуары князя Сангушки // Исторический вестник. 1898. Т. 73. С. 106; Французы в России. 1812 год по воспоминаниям современников-иностранцев. М., 1912.
11. РГИА, ф. 1409, оп. 1, д. 741, л. 1—6; ф. 1409, оп. 1, д. 828, л. 12; ф. 1409, оп. 1, д. 710 (ч. 1.), л. 163; НИА РБ, ф. 295, оп. 1, д. 6151, л. 17—26 об.; ф. 2001, оп. 1, д. 561, л. 11—16; ф. 1297, оп. 1, д. 5384, л. 1—6; ф. 295 оп. 1, д. 6151, л. 12—16; ГАРФ ф. 109, оп. 58, д. 326, л. 1—19.
12. *Военский К. А.* Последний из ветеранов Великой армии: Исторические очерки и статьи, относящиеся к 1812 году. М., 1911. С. 3—12; Священной памяти Двенадцатый год: Исторические очерки, рассказы, воспоминания и др.: статьи, относящиеся к эпохе Отечественной войны. СПб., 1912; *Военский К. А.* Из воспоминаний о последнем офицере армии Наполеона I // Русская старина. 1896. № 4.
13. *Лискин Ю.* Верейский след сокровищ Бонапарта // Клады и сокровища. 1998. № 5—6. С. 6—7.

SUMMARY

*One of the aspects of the 1812 Patriotic War events, the fortune of Napoleon's Moscow trophies in prerevolutionary historiography are discussed.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 930"19/20"

*І. А. Груца*

# РАЗГЛЯД ПЫТАННЯ ЛЁСУ МАСКОЎСКІХ ТРАФЕЯЎ У ГІСТАРЫЯГРАФІІ САВЕЦКАГА І ПОСТСАВЕЦКАГА ПЕРЫЯДАЎ

У савецкай гістарыяграфіі праблема лёсу маскоўскіх трафеяў у вайне 1812 г. амаль не разглядалася. Як выключэнне можна прывесці артыкул Н. Бялянчыкава «Лёс скарбаў, выкрадзеных Напалеонам у Маскве». У ёй на аснове абагульнення звестак з мемуараў ветэранаў Вялікай арміі паўтаралася версія, якая прапаноўвалася яшчэ буржуазнымі гісторыкамі, аб тым, што маскоўскія трафеі былі адбіты рускімі войскамі на Панарскіх узгорках [1].

У навуковых манаграфіях, прысвечаных вывучэнню вайны 1812 г., праблема лёсу гісторыка-культурных і рэлігійных рэліквій рускага народа, нарабаваных напалеонаўскай арміяй у Маскве, не ўзнімалася. Выключэннем служыць праца лаўрэата Ленінскай і Дзяржаўнай прэмій СССР, члена-карэспандэнта АН СССР П. А. Жыліна «Айчынная вайна 1812 года», апублікаваная ў 1968 г. і двойчы перавыдадзеная ў 1974 і 1988 гг. У ёй як водгук на газетныя публікацыі аб пошуку напалеонаўскіх скарбаў змяшчаецца крытыка версіі Сегюра аб затапленні ўсёй «маскоўскай здабычы» ў Семлеўскім возеры. Па меркаванні П. А. Жыліна, у возеры магла быць патоплена толькі найбольш груваcтая частка трафеяў: гарматы і старажытныя стрэльбы. Золата і каштоўныя камяні павінны былі заставацца ў абозе напалеонаўскай арміі і пасля Семлева. П. А. Жылін выказаў свае адносіны да праблемы лёсу маскоўскіх трафеяў Напалеона наступнымі словамі: «Дзе менавіта схавана «маскоўская здабыча», сказаць цяжка» [2, с. 252—253].

У двух перавыданнях манаграфіі, апублікаваных на працягу наступных дваццаці год, П. А. Жылін не ўнёс ніякіх дапаўненняў або